ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
15 СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 2 (1523)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
## ТЭЛЕТАЙП
«УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

### На факультэце журналістыкі

разгарнулася кампанія па абмеркаванню праекта новай рэдакцыі Статута ВЛКСМ. Нядаўна ва ўсіх групах факультэта прайшлі камсамольскія сходы з адзіным парадкам дня, на якіх вялася сур'ёзная, дзелавая размова. Усе камсамольцы аднадушна падтрымалі ўнесеныя змяненні Статута, выказалі свае прапановы. Зараз усе прапановы, вылучаныя камсамольцамі факультэта, разглядаюцца ў камітэце камсамола універсітэта.

А. ЗАЕРКА,
студэнт факультэта журналістыкі.

### Апорнай кропкай

выдавецтва «Вышэйшая школа» з'яўляецца магазін «Навукова-тэхнічная кніга». Сярод літаратуры, якую выпускае гэтае выдавецтва, галоўнае месца займаюць падручнікі і вучэбныя дапаможнікі. Каб пазнаёміцца з яго асартыментам, не адкладвайце свой візіт у дом № 48 па Ленінскаму праспекту. Нам можна тэлефанаваць і атрымаць даведку па нумарах: 33-44-32, 33-48-58.

Г. ХІТРЫК,
таваразнаўца па рэкламе.

### Рэспубліканскі конкурс

на лепшую студэнцкую работу аб помніках гісторыі і культуры, прысвечаны 70-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, аб'явілі калегія МінВНУ БССР і прэзідыум Рэспубліканскага савета Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.

Конкурс праводзіцца ў тры туры: I — унутры ВНУ (снежань — сакавік), II — абласны (красавік — май), III — рэспубліканскі (верасень — кастрычнік 1987 г.). На конкурс прымаюцца самастойна падрыхтаваныя студэнтамі навуковыя работы і сачыненні, тэматыка якіх звязана з помнікамі гісторыі і культуры. Аб'ём і афармленне не рэгламентуюцца. З тэматычным пералікам можна пазнаёміцца ў пярвічнай арганізацыі таварыства.

Для пераможцаў — заахвочванне ў выглядзе грашовых прэмій.

А. КАДУШЫНА,
нам. старшыні пярвічнай арганізацыі таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры БДУ.

### Выстаўка

студэнцкіх работ, прысвечаная 40-годдзю Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, адкрылася ў Палацы мастацтваў (вул. Казлова, 3). Выстаўка дае ўяўленне аб сучасным дні буйнога ў рэспубліцы інстытута.

А. САЎЧЫК.

## ЦІХА, ІДЗЕ СЕСІЯ!



*амаль усё пра яе*



*МАЛЕНЬКАМУ Рыгору-Марыусу з якой нагоды хвалявацца? Пакуль што яго трымаюць моцныя, надзейныя бацькоўскія рукі. Да сапраўднай сустрэчы, сам-насам з Ёй, што ўладарыць вось ужо некалькі тыдняў у вучэбных аўдыторыях і бібліятэках, студэнцкіх інтэрнатах і нават спартыўных залах, засталося ніяк не менш за шаснаццаць гадоў. Але ж першае знаёмства, як бачыце, ужо адбылося. Зусім нечакана. Таму і позірк у яго такі запытальны. Прабачце, а вы б не здзівіліся, калі б мама з татам раптам забыліся пра вас і ўсю сваю ўвагу звярнулі на падручнікі ды канспекты? Іншы, зразумела, пакрыўдзіўся б, нават захныкаць паспрабаваў, а ён — не перашкаджае. Толькі зрэдку ўважліва на бацькоў пазірае: цікава, што яны ў гэтых кнігах такое цудоўнае знайшлі?*

*Дарэчы, не для аднаго толькі Рыгора-Марыуса свет сышоўся ў адзінай кропцы пад таямнічай назвай — «сесія». З дарослымі гэта таксама часам адбываецца. Асабліва калі яны — студэнты. І тады ўжо нікога не кранае, што ў кінатэатры ідзе «лепшы фільм стагоддзя», што надвор'е зусім не для прагулак. Не да іх зараз. І не існуе кніжак, цікавейшых за падручнікі, і няма больш значных думак, як тыя, што падштурхоўваюць: хутчэй, хутчэй... Абы толькі паспець, адшукаць, абмеркаваць, здаць. А потым... Не, і марыць нельга пра адпачынак. Такі ўжо неспакойны час зараз на студэнцкай планеце — сесія.*

*Заўважылі, як доўга гарыць святло ў вокнах студэнцкіх інтэрнатаў? Зазірніце ў кожнае з іх і ўбачыце... Гадзіннік, які стаміўся адлічваць хвіліну за хвілінай, і яго гаспадароў, што не заўважаюць, як прыцішаюць ход стрэлкі.*

*— Разумееш,— гаворыць Сяргей Аляхновіч свайму сябру Эдуарду Гагацкаму,— нічога не выходзіць.*

*Яны зноў шукаюць рашэнне для няпростай задачы. Вядома, на ўсё адразу. Але ў студэнтаў-другакурснікаў хімічнага факультэта павінна атрымацца.*

*Таму, хто далей за падручнік нічога не бачыць, здаецца, што таямнічая госця, якая не пажадала ціхенька пасядзець у куточку, а пачала патрабаваць да сябе вялікай увагі, звярнула толькі на агеньчыкі студэнцкага інтэрната. На самай справе патур-*

*(Працяг на 2-й стар.).*

*пабочных асоб няма!*

## Чаротавы кот і іншыя

— Вось у гэтыя дзверы, потым прама, налева і па калідоры, убачыце далей самі,— і ўсёведаючы палец вахцёршы паказаў на нейкія дзверы.

Следуючы яе ўказаннямі, знаходжу сціплую шыльдачку. ЁН!

ЧАС ІСНАВАННЯ — 62 гады. Прадстаўляе 2,5 тысячы экспанатаў, у тым ліку мінулага стагоддзя. Сабраныя М. А. Мензбергам, Л. Б. Бемэ, У. М. Шпітнікавым, В. Л. Біянкі, М. А. Северцавым экзатычныя жывёлы з Антарктыкі, Амерыкі, Афрыкі, Аўстраліі, Карыбскага мора і Індыйскага акіяна. На міжнароднай выстаўцы паляўнічых трафеяў у Балгарыі яго экспанат удастоены залатога медаля. З ім знаёмы госці з Венгрыі, Польшчы, Мексікі, ФРГ, Балгарыі, ГДР, В'етнама, Японіі і іншых краін свету.

Дык хто ён?

Заалагічны музей біялагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. Ці многа мы чулі пра яго? І яшчэ менш, напэўна, ведаем.

Згадзіцеся, што памяшканне у 250 квадратных метраў уяўляецца вельмі сціплым і неспрыяльным для дэманстрацыі багацейшай фауны рэспублікі. У музеі налічваецца болей 40 відаў жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу СССР, і ўсе віды рэспубліканскай Чырвонай кнігі.

Чорны лебедзь і лебедзь-шыпун, магеланаў гусь і егіпецкая чапля, чаротавы кот і тыгравы вуж, кудравы пелікан і грывасты баран ужо сёння могуць прынесці задавальненне дапытлівым біёлагам.

Ды і не толькі ім!

Завірухі не адразу замялі сляды машын кінастудыі «Беларусьфільм», Беларускага тэлебачання, БТЮГ, Беларускага драматычнага тэатра імя Я. Купалы. Сто шостае аддзяленне сувязі і па сённяшні дзень штампуе канверты з Кіева, Віцебска, Ленінграда, Новасібірска, Ашхабада, Уладзівастока, Гродна і Гомеля.

Э. САЕВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

**ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?**

## Студэнту ці правяраючаму?

УВАЖЛІВА прачыталі матэрыял «Студэнту ці правяраючаму?» у партбюро фізічнага факультэта,— адказвае сакратар партбюро гэтага факультэта І. П. Казлоў.— Крытыку ў адрас «КП» фізфака прызнаём правільнай. Лічым, што выпуск дзвюх насценак «КП» і трох «Маланак» з пачатку навучальнага года для факультэта з'яўляецца недастатковым. Камітэту камсамола фізфака даручана наладзіць сістэматычны выпуск «КП», адказнаму за выпуск С. Філю ўказана на недахопы ў рабоце, кантроль за выпускам «КП» даручаны сакратару камсамольскай арганізацыі І. Ганчаронку.

У цяперашні час на факультэце праводзіцца вялікая наглядна-агітацыйная работа. Абнаўляюцца спартыўныя, камсамольскія і прафсаюзныя стэнды, праводзіцца конкурс на лепшае афармленне кафедральных стэндаў.

• • •

КРЫТЫЧНАЯ карэспандэнцыя «Студэнту ці правяраючаму?», надрукаваная ў «Беларускім універсітэце» 11 снежня 1986 года, абмеркавана на партыйным сходзе і ў камітэце камсамола гістарычнага факультэта,— паведамляе нам сакратар партбюро гэтага факультэта М. Э. Часноўскі.

Факты, прыведзеныя ў ёй, пацвярджаюцца. Сапраўды, «састарылася» наглядная агітацыя на V паверсе, зацягнулася яе афармленне і на VI. Гэта тлумачыцца ў значнай ступені тым, што адміністрацыйна-гаспадарчая частка, нягледзячы на неаднаразовыя заяўкі, не забяспечвае факультэт драўлянымі рэйкамі для мацавання новых стэндаў.

Газета «Гісторык» у кастрычніку-лістападзе 1986 года выходзіла нерэгулярна. За прагалы ў рабоце зняты з пасады рэдактар насценгазеты дацэнт Ю. Я. Івонін, крытычныя заўвагі выслухалі на партсходзе член партбюро дацэнт А. І. Кажушкоў, адказны за наглядную агітацыю, камітэт камсамола.

**перабудова ВНУ: стратэгія і тактыка паскарэння**

# АДКАЗНАЯ РОЛЯ ГРАМАДАЗНАЎЦАЎ

**Асновай сучаснага прафесійнага выхавання становіцца паглыбленая і паслядоўная інтэграцыя адукацыі, навукі і вытворчасці. У працэсе перабудовы прадугледжваецца пераход да новых прынцыпаў узаемаадносін сістэмы вышэйшай адукацыі з галінамі народнай гаспадаркі, умацаванне іх узаемнай зацікаўленасці ў павышэнні узроўню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў, значным паляпшэнні іх выкарыстання на вытворчасці.**

ПЕРАБУДОВА прадугледжвае круты паварот да развіцця самастойнасці студэнта, яго творчых здольнасцей, фарміравання адказных адносін да выбранай прафесіі, да свайго станаўлення як грамадзяніна сацыялістычнай Радзімы. Для гэтага прапаноўваецца вялікі комплекс мер. У яго ўваходзяць: удасканаленне правілаў прыёму з тым, каб найбольш поўна ўлічваць прафесійную арыентацыю абітурыентаў; змяншэнне абавязковай вучэбнай нагрузкі студэнта і вызваленне часу для самастойнай работы і навуковых даследаванняў; разбуйненне студэнцкіх груп і індывідуальная работа з кожным студэнтам.

Перабудова прадугледжвае ўкараненне метадаў інтэнсіўнага навучання, арыентаваных на развіццё крытычнага мыслення студэнта, выпрацоўку трывалых перакананняў. І, урэшце, развіццё ўсіх форм творчай актыўнасці: ад вучэбнай працы і грамадскай работы да мастацкай самадзейнасці; разгортванне сістэмы студэнцкага самакіравання.

Перабудова датычыць усіх, кожнага студэнта, кожнага выкладчыка.

У кафедраў грамадскіх навук асаблівая адказнасць перад партыяй за перабудову вышэйшай школы. Гэта ідэалагічныя кадры. Марксізм-ленінізм вывучаюць студэнты ўсіх спецыяльнасцей. Мы чакаем ад грамадазнаўцаў мэтанакіраванай работы па прапагандзе, канкрэтызацыі і рэалізацыі рашэнняў XXVII з'езда. Важна давесці да кожнага студэнта сутнасць перабудовы, яе неабходнасць, зрабіць яго актыўным і зацікаўленым удзельнікам гэтага працэсу.

Выкладчыкі-грамадазнаўцы вядуць прапагандысцкую работу, арганізуюць палітыка-выхаваўчы працэс. Лепшыя іх прадстаўнікі ўваходзяць, як правіла, у састаў партыйнага камітэта. Адсюль іх высокая адказнасць за палітычныя абставіны ў ВНУ. Яны могуць і павінны ўсё зрабіць дзеля таго, каб у ВНУ была створана атмасфера дзелавітасці, патрабавальнасці, адзінства слова і справы, таварыскай крытыкі, узаемадапамогі, таго маральнага клімату, без якога немагчыма хутка і эфектыўна зжыць недахопы, разгарнуць шырокім фронтам барацьбу за ўвасабленне ў жыццё рашэнняў XXVII партыйнага з'езда.

Ва універсітэце на 9-ці кафедрах грамадскіх навук працуе зараз 181 выкладчык. Гэта вялікі інтэлектуальны і выхаваўчы патэнцыял. Аднак выкарыстоўваўся ён недастаткова эфектыўна.

Галоўнае, над чым мы павінны сёння думаць і працаваць, галоўнае ў выкладанні грамадскіх навук — гэта якасць. І тут паўстае задача творчага абнаўлення зместу выкладання і пераадолення ў яго методыцы старых хвароб: фармалізму, палітычнай кан'юнктуршчыны і паказухі. Нашы грамадазнаўцы сталі вялікімі майстрамі абстрактнага тэарэтызавання. Цытаты і лозунгі нярэдка атрымліваюць статус навуковых доказаў і аргументаў, замяняюць пошук ісціны. Многія выкладчыкі дапускаюць спрошчаную і аблегчаную трактоўку складаных праблем развіцця нашага грамадства, уходзяць ад аналізу новых праблем сучаснасці, якія хвалююць моладзь.

Фармалізм і яго родны брат — паказны дабрабыт — многаабліччы і жывучы, як пустазелле. 90 працэнтаў — выдатных і добрых адзнак, а «задавальняюча» амаль няма. Але сапраўдны экзаменатар — жыццё — ставіць у многіх выпадках іншыя ацэнкі, бязлітасна выкрываючы славесны характар перакананняў.

Нашы выпускнікі нярэдка не ўмеюць адстойваць свае погляды ў спрэчках і палітычных дыскусіях, выказваюць разлад паміж веданнем тэарэтычных палажэнняў і рэальнымі паводзінамі, мяшчанскі падыход да жыццёвых каштоўнасцей. Зразумела, за гэтыя светапоглядныя і маральныя выдаткі нясе адказнасць увесь калектыў ВНУ, але ў першую чаргу віна кладзецца на кафедры грамадскіх навук.

Ці ўзяць, напрыклад, неапраўданае фарміраванне росту колькасці ўдзельнікаў Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх работ па грамадскіх навуках. Тут таксама «ахоп» пад 90 працэнтаў. У той час як колькасць навуковых студэнцкіх гурткоў пры грамадазнаўчых кафедрах, у якіх студэнты могуць весці сапраўдныя даследаванні, вельмі невялікая.

Хачу сказаць і аб прафанацыі навуковай работы, якая прыпісваецца студэнтам. Гутарка ідзе аб студэнцкіх рэфератах па грамадскіх дысцыплінах, з якімі яны выступаюць на семінарскіх занятках. Кожны студэнт вучэбнай групы павінен выступіць з такім рэфератам па той ці іншай дысцыпліне. У выніку атрымліваецца, што выкладчык лічыцца кіраўніком 50—70 навуковых работ, ажыццяўляецца такое кіраўніцтва 1—2 месяцы, і гэта ўлічваецца пры падвядзенні вынікаў спаборніцтва. Пераможцы па колькасці ўзнагароджваюцца граматамі. Тое, што прывучаюць студэнтаў пісаць рэфераты і выступаць з імі на семінарах — гэта пахвальна. Студэнты паглыбляюць свае веды і набываюць некаторы станоўчы вопыт прамоўніцкага майстэрства. Але лічыць гэта навуковай работай не трэба.

Мы гаворым пра студэнтаў з пазіцыі выкладчыка, але вельмі важная зваротная сувязь, важна ведаць і што думае студэнт пра выкладанне грамадскіх дысцыплін.

Неадкладная задача — удасканаленне методыкі выкладання. Найперш за ўсё неабходна пераадолець чыста інфармацыйны падыход да навучання, накіраваць намаганні на выпрацоўку ў студэнта ўмення аналізаваць працэсы і з'явы грамадскага жыцця, выкарыстоўваючы марксісцка-ленінскую метадалогію. Для гэтага належыць надаць асаблівую ўвагу практычнаму боку навучання, перагледзець суадносіны лекцый і семінараў на карысць апошніх. Роля лекцый пры гэтым не змяншаецца, а ўзрастае. Лекцыя павінна зацікавіць студэнта, абудзіць яго да актыўнай самастойнай працы, дапамагчы арыентавацца ў навейшай навуковай інфармацыі. Але самае галоўнае, іменна на лекцыі выкладчык можа наглядна прадэманстраваць выкарыстанне метадалагічных прынцыпаў рэвалюцыйнай тэорыі да аналізу праблем грамадскага развіцця. Іменна тут студэнт мае магчымасць назіраць рух думкі выкладчыка, логіку яе развіцця.

Лекцыя — гэта своеасаблівы від мастацтва, калі адзін чалавек адначасова і аўтар тэксту, і рэжысёр, і выканаўца. Быць сапраўдным уладаром думак сваіх вучняў — задача не з лёгкіх. Але вызначальная для педагога.

Не выпадкова на камсамольскай справаздачна-выбарнай канферэнцыі выступаючыя дэлегаты ўнеслі прапанову ажыццяўляць ананімнае анкетаванне студэнтаў на прадмет якасці чытаемых лекцый і семінарскіх заняткаў; праводзіць абмеркаванне рэзультатаў анкетавання на кафедрах і саветах, а потым друкаваць у шматтыражцы і насценным друку. Напэўна, з часам такая форма ацэнкі лекцый пачне ўкараняцца. Пакуль у рашэнні камсамольскай канферэнцыі пакінуты запіс: «Распрацаваць сістэму студэнцкай ацэнкі лекцый і семінарскіх заняткаў і ўнесці на разгледжанне рэктарата».

На канферэнцыі было сказана пра нізкую якасць лекцый па педагогіцы, у якіх нярэдка прапагандуюцца вядомыя ісціны і старыя матэрыялы пяцігадовай даўнасці.

Перабудова патрабуе, каб на змену пасіўным, шкалярскім формам семінарскіх заняткаў, славутаму «пытальна-адказнаму» метаду прыйшлі сапраўдныя дыскусіі па злабадзённых праблемах.

За апошні час на кафедрах прымаюцца меры па ўкараненню на семінарах актыўных форм навучання. З гэтай мэтай выкарыстоўваюцца метад творчай дыскусіі, семінарскія заняткі ў форме «малых груп», дзелавых гульняў, «круглых сталоў», рэфератыўнага выкладання дыскусійных праблем і г. д.

Аднак гэта толькі пачатак пошукаў. Творча, па-новаму семінарскія заняткі вядуць адзінкі выкладчыкаў. Адчуваецца яшчэ адрыў тэорыі ад практыкі.

Неабходна забяспечыць безумоўны прыярытэт самастойнай працы студэнта. Гэта не проста. Выдзеліць час — гэта яшчэ не ўсё. Трэба даць заданне. Яно павінна быць цікавым, адпавядаць магчымасцям студэнта. І трэба кантраляваць яго выкананне. Кантраляваць па сутнасці, праяўляючы інтарэс да рэзультатаў, дапамагаючы выбраць напрамак пошуку, г. зн. ажыццяўляючы «кантроль, які развівае», не проста ацаніць зробленае, а аказаць дапамогу і падтрымку.

У цяперашні час ў БДУ навучаецца болей 900 замежных студэнтаў з 80 краін. Задача грамадазнаўцаў — забяспечыць іх ідэйна-палітычную падрыхтоўку, узброіць навыкамі марксісцка-ленінскага падыходу да сацыяльных з'яў і працэсаў, звязаць выкладанне рэвалюцыйнай тэорыі з праблемамі краін і рэгіёнаў, з якіх яны прыехалі. Гэтыя людзі прыехалі да нас вучыцца не толькі прафесіі, але і ладу жыцця. Вучыцца сацыялізму. Мы аказваем дрэнную паслугу ім і аўтарытэту нашай дзяржавы, калі падыходзім да іх навучання і асабліва ацэнкі якасці іх ведаў з нізкай патрабавальнасцю. А гэта, на жаль, пакуль яшчэ ёсць.

Яшчэ адна заўвага. Няхай нашы студэнты, з дзяцінства звыклыя з бясплатнай адукцыяй, медыцынскім абслугоўваннем, забеспячэннем працай, пенсіямі і іншымі дабротамі, бліжэй пазнаюць жывых сведкаў з іншага свету, якія на сваім лёсе і лёсе сваіх родных пазналі, што такое беспрацоўе, галеча, голад, які цяжкі шлях у барацьбы за сацыяльную справядлівасць.

Пераадолець негатыўныя з'явы можна толькі абуджаючы актыўнасць самой моладзі. Самае галоўнае — рашуча павысіць адказнасць студэнтаў за якасць вучэбнай працы. МінВНУ адмяніў умоўны перавод студэнтаў. Цяпер будуць адлічвацца ўсе тыя, хто мае нездавальняючыя адзнакі да пачатку навучальнага года. Гэта накіравана на стварэнне прынцыпова новай атмасферы строгай патрабавальнасці, якая з'яўляецца найбольш эфектыўнай умовай выхавання.

XXVII з'езд КПСС, Усесаюзная нарада загадчыкаў кафедраў грамадскіх навук паставілі перад намі грандыёзныя задачы вялікага партыйнага і агульнанароднага значэння. Асноўныя рысы перабудовы вызначаны. Яна пачалася. Ніхто і ніштто яе не зможа спыніць. Знайсці сваё месца ў гэтым жыватворным працэсе, прыкласці максімум намаганняў у яго ажыццяўленні — абавязак кожнага з нас.


У. БАГДАНАЎ,
прарэктар універсітэта,
прафесар.


# ЦІХА, ІДЗЕ СЕСІЯ!

**амаль усё пра яе**

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).*

*бавала яна і іншых.*

*— Студэнцкая сесія — вельмі адказны момант і ў нашым жыцці,— гаворыць старшы бібліятэкар залы прыродазнаўчых навук Ніна Фёдараўна Бахар. Сумнявацца ў гэтым не прыходзіцца, таму што 25 гадоў працуе Ніна Фёдараўна ў бібліятэцы. Гэтая сесія для яе юбілейная — пяцідзесятая.*





*— Афармілі выстаўку новых выданняў. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца зараз падручнікі па праграміраванню, апошнія пастановы партыі і ўрада. Своеасаблівым барометрам з'яўляецца для нас колькасць пустуючых у зале месцаў і кніг на паліцах. Калі замест звычайных 70 чытачоў прыходзіць 135, калі патрабуецца пазычаць падручнікі ў супрацоўнікаў абанемента, каб забяспечыць усіх жадаючых — гэта значыць прыйшла сесія. І тут толькі паспявай афармляць заказы на літаратуру, што знаходзіцца ў кнігасховішчы, дапамагаць навічкам адшукаць патрэбны ім падручнік.*



*На кожны факультэт сесія прыходзіць па-рознаму. У той час калі на мехмаце і гістфаку яшчэ ішлі залікі, студэнт III курса фізічнага факультэта Ігар Акушэвіч ужо паспеў атрымаць першую адзнаку і падзяліцца ўражаннямі са сваёй аднакурсніцай Наташай Макаёвай. А за дзвярыма аўдыторыі 477-й фізічнага факультэта ішоў экзамен па атамнай фізіцы.*

*(Заканчэнне на 4-й стар.).*






# НАРОДНАЯ ПЕСНЯ ЗМАГАЕЦЦА

У ДЗЕНЬ адкрыцця Берлінскага фестывалю «Чырвоная песня», калі кожны ўдзельнік прадстаўляў адну сваю песню, ён спеў «Гуантанамэра», і публіка гучнымі апладысментамі прывітала ветэрана эстрады. Гэта быў Піт Сігер, ён спяваў разам з прадстаўнікамі Лацінскай Амерыкі, песню падхапіла ўся зала. І на наступных трох канцэртах яднанне з залай было такім жа. Са сваёй непасрэднасцю, чароўнасцю і моцным эмацыянальным зарадам, дзіўным для 67-мі гадоў, Піт Сігер стаў сапраўднай сенсацыяй фестывалю.

«Калі выконваеш песню з поўнай аддачай,— гаворыць спявак, — заўсёды слухачы пачынаюць спяваць разам са мной. Добры выканаўца не той, хто віртуозна грае на банджа ці гітары. Трэба мець здольнасці, каб захапіць аўдыторыю, каб яна паверыла тваёй песні. Упэўнены, што асноўная праблема ў тым, каб прымусіць людзей дзейнічаць, а не заставацца абыякавымі сведкамі».

І гэта ён пацвярджае сваім мастацтвам і жыццём. Яго песні блізкія чалавечай шчырасці. Тэмы самыя актуальныя — ганебная вайна ў В'етнаме, барацьба лацінаамерыканскіх народаў за незалежнасць, за адзінства рабочага класа, за правы на працу для ўсіх простых амерыканцаў. Таксама змагаюцца за мір у наш складаны час песні пра інтэрнацыянальныя брыгады ў Іспаніі, трагедыю Хірасімы і Нагасакі.

Адстойваючы пазіцыі фалькрэнесанса, Піт рэгулярна выступае ў каледжах перад студэнцкай моладдзю. Як вялікі прыхільнік джаза, Баха і Белы Бартака, са сваімі энцыклапедычнымі ведамі ў фальклоры, Піт Сігер праклаў своеасаблівы мосцік паміж традыцыйнай народнай музыкай амерыканскіх сялян і сучаснай гарадской песняй. Піт Сігер гастраляваў у Японіі, Аўстраліі, Англіі, Чэхаславакіі.

Як цвёрды абаронца сваіх сацыяльных пазіцый, палітычных і музычных перакананняў, Піт Сігер заўсёды застаецца прыкладам грамадзяніна-мастака, камертон якога настроены на злабадзённасць.

# КАРАЛЕВА СУЧАСНЫХ РЫТМАЎ

ЦЯПЕР не знойдзеш ніводнай дыскатэкі, дзе б не было чуваць голасу гэтай спявачкі. Паказ па ЦТ у праграме «мелодыі і рытмы замежнай эстрады» завяршыў справу — папулярнасць С. С. Кейч у нашай краіне яшчэ больш узнялася.

Яе нечаканы ўзлёт, які падобны на з'яўленне каметы, мае сваю гісторыю. Нарадзілася С.С. Кейч у 1964 годзе ў Галандыі, на музычную «лесвіцу» уступіла рана, удзельнічала ў конкурсах маладых талентаў, палову з якіх выйграла. Да кар'еры сольнай спявачкі яна спрабавала сілы ў ансамблі дзяўчат «Аптымал». Хто ведае, як бы склаўся яе лёс, калі б яе не ўбачыў музычны прадзюсэр Дзітэр Боглен, вядомы нам як кіраўнік дуэта «Модэрн тонкінг». Праслухаўшы дзяўчат, Боглен адразу вылучыў С. С. Кейч як добры «матэрыял». У гэты час Д. Боглен паспяхова абгрунтаваў канцэпцыю сучаснай размовы пры дапамозе музыкі. І яму спадабалася рухавасць, абаяльнасць, манера выканання маладой спявачкі.

Поспех выканаўцаў залежыць ад індустрыі грамзапісу. Таму Боглен запрасіў С. С. Кэйч у сваю студыю і пазней яе голас можна было пачуць на адной з пласцінак, а ў хуткім часе з'явіліся міньён «Прычына тваёй маладосці» і першы альбом-гігант «Кейч за Кейч».

Запіс гэтай пласцінкі трапіў на магнітафонныя стужкі, і хутка аб ёй даведаліся ў многіх краінах, у С. С. Кейч з'явілася многа прыхільнікаў. Добрую музычную апрацоўку яе выступленняў стварае ансамбль «Коала Ньюс». Але ж сама С. С. Кейч разумее, што ў час, калі штодзень на музычным небасхіле з'яўляюцца новыя музычныя зоркі, нішто не працягваецца вечна, і каб падтрымаць сваю папулярнасць, яна часта здымаецца на тэлебачанні. Ёй прапануюць гастролі многія краіны, тры разы яна была ў ГДР, а ў хуткім часе яе дыск выйдзе ў Балгарыі, які павінен з'явіцца і ў нашых магазінах.

Безумоўна, не варта думаць, што С. С. Кейч ва ўсім бездакорная. Поспех спявачкі грунтуецца на бліскучых мелодыях Дзітэра Боглена і законах музычнай камерцыі.

# Група «Здароўе»

ЗА АПОШНІ час на савецкай эстрадзе з'явілася шмат новых груп. І «Тэатр песні» Алы Пугачовай адкрыў нам яшчэ адну — студыйную групу «Здароўе».

Чаму студыйную? Гэта не новыя маладыя таленты, гэта «тэхнічны персанал» групы «Рэцытал». Усе тэксты і мелодыі стварыў... мастак па свету Мікалай Канавалаў, а гукарэжысёр Аляксандр Кальянаў спеў. Аднак і прафесійныя музыканты спатрэбіліся. Гітарыст «Рэцытала» Аляксандр Ляўшын аранжыраваў музыку і сыграў некалькі сольных партый, вядомы па ўдзелу ў «Машыне часу» і «Нядзелі» П. Падгарадзецкі граў на клавішных, Валянцін Лезаў з «Рок-атэлье» — на бас-гітары, а за ўдарныя сеў Аляксандр Герасімаў з групы «Полымя».

Такім чынам незвычайны эксперымент удаўся. І аматары эстрады палічылі, што стварылася самастойная група з актуальнымі тэкстамі песень і сучаснымі рытмамі.

*Музычны клуб падрыхтаваў студэнт філалагічнага факультэта Ігар Войніч*

**спартыўнае жыццё**

# ЗАПРАШАЕМ У ГІМНАСТЫКУ

**Вось ужо некалькі дзесяткаў гадоў у нашым універсітэце працуе секцыя спартыўнай гімнастыкі. У цяперашні час у ёй займаецца 35 чалавек — прадстаўнікі амаль усіх факультэтаў.**

ЧЫМ ЖА ПРЫЦЯГВАЕ студэнтаў спартыўная гімнастыка? Перш за ўсё гэта развіццё сілы, спрытнасці, каардынацыі рухаў, гібкасці, без якіх немагчыма жыццядзейнасць здаровага арганізма. У працэсе трэніровак у маладых людзей умацоўваецца воля, набываюцца такія рысы характару, як рашучасць, настойлівасць, ініцыятыўнасць. Гімнастыка, як любіць паўтараць трэнер Уладзімір Міхайлавіч Рэйзін,— спорт інтэлектуальны. І тлумачыць, што гімнастыкай нельга займацца бяздумна. Кожнае практыкаванне, нават самы просты элемент, патрабуе ўсебаковага аналізу. Толькі ў гэтым выпадку магчыма тэхнічна правільнае выкананне практыкаванняў.

Навука і спорт узаемадзейнічаюць. Лёгка заўважыць, што выкананне ўсіх практыкаванняў у спартыўнай гімнастыцы, якія нязменна здзіўляюць нас сваёй прыгажосцю і лёгкасцю выканання, заснавана на строгім прытрымліванні законаў фізікі. Многія студэнты-спартсмены пазней дасягнулі пэўных поспехаў і на навуковай ніве. Трэба ўспомніць дацэнта кафедры тэорыі функцый М. Сакалова, кандыдата фізіка-матэматычных навук Ю. Цішына.

Штогод увосень праводзяць новы набор у секцыю. І адбываецца ён без абмежаванняў.

— Ніякіх адбораў тут і не трэба,— кажа трэнер У. М. Рэйзін. — Тыя, хто выбраў не свой від спорту, ці тыя, каму гэта не спадабаецца, урэшце кідаюць заняткі спартыўнай гімнастыкай. Але такіх нямнога. Асноўная частка студэнтаў займаецца ў секцыі з задавальненнем. І вынікі гавораць самі за сябе. Так, студэнты Анатоль Шчур і Ігар Зыгмантовіч здалі нормы другога разраду і цяпер настойліва імкнуцца дасягнуць больш высокіх вышынь майстэрства.

У спартыўнай зале ў час трэніровак пануе атмасфера напружанай працы. Пад пільным поглядам трэнера юнакі старанна займаюцца на кані, перакладзінах, выконваюць розныя акрабатычныя элементы. У зале — усё неабходнае для заняткаў спартыўнай гімнастыкай. Было б толькі жаданне. Калі яно ёсць, прыходзьце. Не пашкадуеце!

В. МІНКОЎ,
І. ГУКОЎСКІ,
студэнты факультэта журналістыкі.

**амаль усё пра яе**

# ЦІХА, ІДЗЕ СЕСІЯ!

*(Заканчэнне. пачатак на 1-й и 2-й стар.).*





*Тут, як заўсёды здараецца на экзамене, былі і поспехі,— першае «выдатна», атрыманае Мікалаем Карнеевым, і першыя няўдалыя адказы. А пакуль студэнты рыхтаваліся, мы, парушыўшы існуючую на экзаменах традыцыю, пачалі задаваць пытанні экзаменатару — Валерыю Яфімавічу Гракаву.*

*— З якім пачуццём выкладчык ацэньвае адказ студэнта адзнакай «незадавальняюча»?*

*— З вялікай расчараванасцю. Незадавальняючая адзнака сведчыць пра тое, што ўвесь семестр студэнт не працаваў. Гэтае нечаканае адкрыццё тым больш непрыемна, калі ведаеш: студэнту трэба было толькі зазірнуць у падручнік. Праўда, не перад самім экзаменам, а раней...*

*— Часцей за ўсё здараецца, што падрыхтоўка да экзаменаў пачынаецца за некалькі дзён...*

*— Вельмі дрэнная практыка. Многія студэнты лічаць, што ашукваюць выкладчыкаў. На самой справе ўсё выглядае трохі інакш. Уявіце сабе: тры дні студэнт добрасумленна чытае канспект, адкрыць падручнік проста не застанецца часу. Што далей? Звычка вучыць «толькі на дзень экзамена» адыгрывае сваю ролю, і ўжо праз некалькі дзён матэрыял паспяхова забываецца. Нічога палохаючага? Я так не лічу, бо ведаю, што далейшая вучоба, а таксама праца паспяховымі не будуць.*



*— А як жа тэорыя верагоднасці, па якой, як лічаць многія студэнты, можна атрымаць «шчаслівы білет»?*

*— Вы маеце на ўвазе білет, пытанні якога студэнт добра ведае? Але атрымаць добрую адзнаку, не маючы грунтоўных ведаў па поўнаму курсу,— гэты выпадак ужо адносіцца да невераgодных. Да таго ж, калі студэнт амаль усё ведае, то і білетаў шчаслівых — вялікая колькасць.*

*— Што больш за ўсё патрэбна студэнту на экзамене?*

*— Працаздольнасць. Нават прагалы па тых ці іншых пытаннях можна ліквідаваць за кошт «светлай» галавы ў час адказу. Ведамі сваімі таксама трэба ўмець карыстацца.*

*...Зачынім дзверы і вернемся туды, дзе поўным ходам ідзе падрыхтоўка. Што ні кажыце, а ў вынаходлівага студэнцкага народа кожная мінутка выкарыстоўваецца зараз для справы. Прыйдзе на заняткі ў спартыўную секцыю і не звяртаючы ўвагі на ўсё астатняе, зноў зачытваецца падручнікам, ды яшчэ жартуе: «Галава ў нязвыклым становішчы лепш працуе!» Вы яшчэ сумняваецеся? А раптам адкрыццё складанай формулы толькі і чакае вас у спартыўнай зале? Ці нават на кухні? Моманты натхнення не выбіраюць месца і часу. Трэба толькі раней падрыхтавацца да сустрэчы з імі.*



М. ЗАГОРСКАЯ,
наш кар.
Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

15 студзеня 1987 года.
АТ 06037 Зак. 135.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЕЎ.